*Л.В. Снапкова, старшы выкладчык*

# РОЛЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ХАРАВЫХ ДЫСЦЫПЛІН
(факультэт завочнага навучання)

Самастойная работа з'яўляецца не проста важнай формай навучальнага працэсу, а павінна стаць яго асновай. Яна прадугледжвае арыентацыю на актыўныя метады авалодання ведамі, развіццё творчых здольнасцей, пераход ад паточнага да індывідуальнага навучання з улікам магчымасцей асобы. Павелічэнне ролі самастойнай работы азначае перагляд арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ВНУ. У той жа час арганізацыя самастойнай работы (планаванне, яе формы і метады, сістэма адсочвання вынікаў) з'яўляецца адной з найбольш слабых месцаў у практыцы ВНУ. Асаблівай увагі патрабуюць пытанні матывацыйнага, працэсуальнага, тэхналагічнага яе забеспячэння.

Межы паміж гэтымі відамі работы дастаткова размытыя, а самі віды перакрыжоўваюцца.

Самастойная работа – адна з важнейшых частак навучальнага працэсу ў ВНУ, асабліва гэта тычыцца завочнага навучання. Пры гэтым найбольшы эфект атрымоўваецца тады, калі маюць месца сістэматычнасць і раўнамерная інтэнсіўнасць работы студэнта ў семестры.

Мэта самастойнай работы – вывучэнне тэорыі і выпрацоўка ўменняў прымяняць яе на практыцы. Калі лекцыі вызначаюцца афіцыйным раскладам вучэбных заняткаў, то змест самастойнай работы і яе паслядоўнасць павінны быць спланаваны выкладчыкам з улікам індывідуальнасці студэнта.

Прывіццё навыкаў самастойнай работы з'яўляецца яшчэ больш актуальнай задачай ВНУ у сучасных умовах хуткага назапашвання і абнаўлення інфармацыі. Навучыць студэнта на ўсё жыццё немагчыма, важна культываваць у ім цікавасць да набыцця ведаў, навучыць яго прыёмам самастойна і творча авалодваць ведамі, абуджаць праявы крытычнага розуму, фантазіі.

Самастойная работа з'яўляецца недастаткова вывучанай і ў той жа час уяўляе найбольшую цікавасць. Менавіта ў ёй праяўляюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матывацыя, мэтанакіраванасць, самаарганізаванасць, самастойнасць, самакантроль. Яна можа служыць асновай перабудовы пазіцыі студэнта ў навучальным працэсе. Важным патрабаваннем з'яўляецца добраахвотнасць і актыўнасць навучэнца.

Вучэбная дзейнасць характарызуецца суб'ектыўнасцю, актыўнасцю, прадметнасцю, мэтанакіраванасцю, свядомасцю. Яна мае пэўную структуру і змест. Знешняя структура вучэбнай дзейнасці мае такія асноўныя кампаненты, як:

– матывацыя;
– вучэбныя заданні на пэўныя сітуацыі;
– вучэбныя дзеянні;
– кантроль, які пераходзіць у самакантроль;
– ацэнка, якая пераходзіць у самаацэнку.

Матывацыя – гэта тое, што вызначае, стымулюе, заахвочвае студэнта да выканання якіх-небудзь дзеянняў. Вучэбная дзейнасць можа быць матывавана цікавасцю да прадмета, спаборніцтвам з мэтай самасцвярджэння, станоўчымі эмоцыямі, актывізацыяй калектыўнага творчага пошуку.

Стварэнне праблемнай сітуацыі прадугледжвае наяўнасць праблемы як суадносін новага і знаёмага, вучэбна-пазнавальнай задачы і здольнасці студэнта рашыць гэту задачу. Іншымі словамі, студэнты павінны быць пастаўлены ў сітуацыю інтэлектуальнай цяжкасці, з якой ім самім павінна быць знойдзена выйсце.

Важным структурным кампанентам вучэбнай дзейнасці з'яўляюцца вучэбныя дзеянні, якія вызначаюцца як спосабы рашэння вучэбных задач. Гэта дзеянні параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, класіфікацыі, абстрагавання і г. д. Яны павінны быць даведзены да пэўнага ўзроўню дасканаласці, г.зн. да выпрацоўкі навыкаў, якія забяспечваюць іх рэзультатыўнае прымяненне ў працэсе творчай дзейнасці.

Вялікая ўвага ў агульнай структуры вучэбнай дзейнасці адводзіцца такім дзеянням, як кантроль і самакантроль, ацэнка і самаацэнка.

У методыцы прынята выдзяляць наступныя ўзроўні самастойнай работы: узнаўленчы (на якім адбываецца паўтарэнне ў копіі), паўтворчы, творчы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фактычна на ўзнаўленчым узроўні пачынаецца засваенне новага. Але пры арганізацыі самастойнай работы доўга затрымлівацца на гэтым не трэба, як і спяшацца. Студэнт павінен правільна засвоіць матэрыял, які спатрэбіцца яму для рашэння больш складаных задач.

На паўтворчым узроўні адбываецца перанос набытых ведаў, навыкаў, уменняў на іншыя, але аналагічныя сітуацыі.

Творчы ўзровень самастойнай работы звязаны з фарміраваннем навыкаў і ўменняў, ажыццяўленнем пошуку новых, больш складаных задач.

Актыўная самастойная работа магчыма толькі пры наяўнасці сур'ёзнай і ўстойлівай матывацыі. Самы моцны матывацыйны фактар – падрыхтоўка да далейшай эфектыўнай прафесійнай дзейнасці. Унутраныя фактары, якія садзейнічаюць актывізацыі самастойнай работы:

– карыснасць выконваемай работы (вынікі публікуюцца, уключаюцца ў курс лекцый, метадычныя дапаможнікі, выкарыстоўваюцца ў прафесійнай рабоце (дыплом) і г. д.);

– удзел студэнтаў у творчай дзейнасці (навукова-даследчая ці метадычная работа);

– увядзенне ў вучэбны працэс актыўных метадаў (гульнёвы трэнінг, у аснове якога – інавацыйныя і арганізацыйна-дзейнасныя гульні);

– удзел у навукова-даследчых канферэнцыях і конкурсах;

– выкарыстанне матывацыйных фактараў кантролю ведаў (адзнакі, рэйтынг, тэсты);

– заахвочванне студэнтаў за поспехі ў вучобе і творчай дзейнасці (стыпендыі, прэміраванне, высокія балы);

– індывідуалізацыя заданняў, якія выкананы ў аўдыторыі і па-за ёй;

– выкладчык – прыклад для студэнтаў (прафесіянал, творчая асоба).

Рашаючая роля ў арганізацыі самастойнай работы студэнта належыць выкладчыку, які павінен працаваць не са студэнтамі ўвогуле, а з канкрэтнай асобай, з яе індывідуальнымі асаблівасцямі і схільнасцямі. Задача выкладчыка – разгледзець і развіць лепшыя якасці студэнта як будучага спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры вывучэнні кожнай дысцыпліны арганізацыя самастойнай работы павінна ўяўляць адзінства трох узаемазвязаных формаў:

а) пазааўдыторная самастойная работа;

б) аўдыторная самастойная работа, якая адбываецца пад непасрэдным кіраўніцтвам выкладчыка;

в) творчая, у тым ліку навукова-даследчая работа.

Віды пазааўдыторнай самастойнай работы самыя разнастайныя: рэфераты, даклады, курсавыя, падрыхтоўка да навукова-тэарэтычных канферэнцый і г. д. Фарміраванню станоўчых адносін студэнта да пазааўдыторнай работы садзейнічаюць разуменне яе мэты, значнасці работы ў прафесійным плане, а таксама ўзровень падрыхтаванасці навучэнца да самастойнай работы. Пры чытанні лекцый у аўдыторыі неабходна кантраляваць засваенне матэрыялу асноўнай масай студэнтаў шляхам, напрыклад, экспрэс-апытанняў і інш.

Такім чынам, пры новых патрабаваннях адукацыі ў цэнтры ўвагі знаходзіцца асоба студэнта, яго самастойная актыўная пазнавальная дзейнасць, у якой выкладчык павінен выступаць усё больш у ролі арганізатара, кампетэнтнага кансультанта і памочніка.

---

1. *Аханов, А.* Самостоятельная работа студентов / А. Аханов // Высшее образование в России. – 2005. – № 11.

2. *Рубаник, А.* Самостоятельная работа студентов / А. Рубаник, Г. Большакова, Н. Тельных // Высшее образование в России. – 2005. – № 6.

3. *Сенашенко, В.* Самостоятельная работа студентов: актуальные проблемы / В. Сенашенко, Н. Жалнина // Высшее образование в России. – 2006. – № 7.

4. *Соколова, Г.Н.* Труд и профессиональная культура (опыт социологического исследования) / Г.Н. Соколова; науч. ред Е. М. Бабосова. – Мн: Изд-во БГУ, 1980. – 144 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ